Міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Адукацыя без межаў”

Аўтары-ўкладальнікі: Галіна Верамейчык, Вольга Пчолкіна

# Outdoor education, альбо
# Адукацыя на прыродзе

метадычны дапаможнік



Мінск, 2008



# Змест

Уступнае слова ....................................................................................................3
Канцэпцыя навучання на прыродзе: тэрміналогія, гістарычныя карані і агляд тэарэтычных падыходаў..........................................................................................4
Мэты навучання на прыродзе ...........................................................................9
Эфектыўнасць адукацыйных праграм у прыродных умовах ............................13
Формы і метады навучання на прыродзе..........................................................14
Дадатак 1. Апісанне выбраных метадаў ..........................................................17
Дадатак № 2. Лэнд-арт.....................................................................................27

It is only in adventure that some people succeed in knowing themselves.
Andre Side



## Уступнае слова

Паважаныя калегі!

Прапануем вам метадычны дапаможнік, прысвечаны адукацыі на прыродзе. На сённяшні дзень дадзеная канцэпцыя з'яўляецца неад'емным складнікам комплексных выхаваўчых і адукацыйных праграм у шмат якіх краінах Заходняй Еўропы, а таксама ў ЗША і Канадзе. Цікаўнасць да гэтага кірунку педагогікі значна ўзмацнілася ў апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя, паколькі сацыяльныя кампетэнтнасці і асабістыя якасці сталі адыгрываць больш заўважную ролю ў грамадскім і асабістым жыцці чалавека. Запатрабаванне «рэальных» (а не віртуальных) пачуццяў і аўтэнтычнасці жыццёвага вопыту ў сучасным свеце высокіх тэхналогій значна вышэй, чым калі-небудзь раней. Матэрыяльнасць і задавальненне ад фізічных і псіхалагічных нагрузак – фундамент сучаснай педагогікі «перажыванняў».



# Канцэпцыя навучання на прыродзе: тэрміналогія, гістарычныя карані і агляд тэарэтычных падыходаў

## *Тэрміналогія і яе разуменне*

**Навучанне на прыродзе** (англ.- *outdoor education*) дае асобе магчымасць развіваць свае сацыяльныя кампетэнтнасці і асабістыя якасці пад час калектыўнага побыту і групавой дзейнасці ў прыродных умовах (у лесе, у полі, на моры і г.д.). Пры гэтым фізічная актыўнасць (кшталту веласпорту, спелеалогіі, парусная і турыстычнага спорту), дапоўненая методыкамі з педагогікі тэатра, гульні, перажывання прыгодаў, псіхалогіі груп і сацыяльнай педагогікі, з'яўляецца невычэрпнай крыніцай для набыцця новага досведу і атрымання новых перажыванняў.

Само вызначэнне «навучанне на прыродзе» часта выкарыстоўваецца для апісання рознага кшталту дзейнасці, якая адбываецца па-за сценамі будынкаў. Дастаткова цяжка даць вычарпальнае і адназначнае азначэнне гэтаму віду адукацыйнай дзейнасці, таму што ў розных культурах і педагагічных традыцыях можна сустрэць шмат адрозненняў у яго трактоўцы.

Часам тэрмін «навучанне на прыродзе» выкарыстоўваюць у якасці сіноніма паняццяў *навучанне праз прыгоды, тэрапія праз перажыванне прыгодаў, адпачынак праз прыгоды, турызм, заснаваны на прыгодах, навучанне ў экспедыцыях, навучанне праз выпрабаванні, эксперыментальнае навучанне, а таксама экалагічнае навучанне*.

Зразумела, пазначаныя тэрміны складана размежаваць, і «навучанне на прыродзе» выкарыстоўваецца як паняцце, якое аб'ядноўвае ўсе вышэйназваныя, альбо ў якасці галоўнага фармуючага прынцыпу навучальных праграм у межах пазначаных падыходаў.

Ніжэй прыведзены некаторыя з вызначэнняў, выпрацаваных прадстаўнікамі розных кірункаў педагагічнай тэорыі – экалагічнай адукацыі, педагогікі інтэрпрэтацый, эксперыментальнага навучання, навучання на прыродзе і г.д.

**Навучанне на прыродзе -** гэта:

- выкарыстанне вопыту ажыццяўлення якой-небудзь дзейнасці на двары (на свежым паветры, па-за будынкам) з мэтай навучання і развіцця асабістых якасцей чалавека. (The Outdoor Institute. Definitions of outdoor education, development training and recreation.);
- навучанне на свежым паветры, атрыманне ведаў аб прыродзе (навакольным асяроддзі), а таксама навучанне на свежым паветры

менавіта з мэтай знаходжання на свежым паветры (Donaldson, G., & Donaldson, L. (1958). Outdoor education: A definition.);

- актывізацыя органаў пачуццяў (слыху, зроку, смаку, тактыльных адчуванняў і інш.) для назірання і ўспрыняцця (Lewis, C. A. (1975). The administration of outdoor education programs);
- эксперыментальны метад навучання шляхам прамой практычнай дзейнасці, якая па большасці адбываецца па-за памяшканнем. У навучанні на прыродзе акцэнт ставіцца на паняцці АДНОСІНЫ – адносіны паміж чалавекам і прыродай (Priest, S. (1990). The semantics of adventure education. In J. C. Miles & S. Priest. Adventure Education.);
- спосаб папаўнення ведаў у межах навучальнай праграмы, прычым такога кшталту навучанне праходзіць па-за памяшканнем. Гэтае вельмі шырокае паняцце ўключае ў сябе экалагічную адукацыю, навучанне па абароне навакольнага асяроддзя, навучанне праз прыгоды, турпаходы, тэрапію праз актыўнасць на прыродзе і некаторыя аспекты адпачынку на прыродзе. (Lappin, E. (2000). Outdoor education for behavior disturbed students.);
- міждысцыплінарны і мульцідысцыплінарны від навучання... спосаб дасягнення мэтаў у межах вучэбнай праграмы (Hammerman, D. R., Hammerman, W. M., Hammerman, E. L. (1985). Teaching in the outdoors.);
- адзін з шэрагу сродкаў нефармальнай адукацыі, які дае магчымасць развіцця асабістых якасцей і сацыяльных кампетэнтнасцей як кожнага чалавека, так і групы цалкам. (Outdoor Edinburgh (n. d.) Outdoor education policy statement. City of Edinburgh Council's Community Education Department.).

## *Гістарычны экскурс*

Сучасная канцэпцыя навучання на прыродзе ўвабрала ў сябе шэраг разнастайных педагагічных пачынанняў і асобных ідэй. У значнай ступені яе з'яўленню спрыяла пашырэнне арганізаваных турыстычных паходаў для моладзі і дарослых у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя ў шмат якіх краінах Еўропы, Вялікабрытаніі, ЗША, Аўстраліі і Новай Зеландыі.

Заснавальнікамі гэтага кірунку лічацца брытанскі грамадскі дзеяч, палкоўнік **Роберт Баден-Пауэл** (1857 - 1941), пачынальнік скаўцкага руху, а таксама нямецкі педагог і грамадскі дзеяч **Курт Хан** (1886 - 1974).

У нямецкамоўнай літаратуры методыка Курта Хана завецца **«педагогікай перажыванняў»** (*Erlebnispädagogik*). Аднак шмат якія з даследчыкаў ставяць гэтае паняцце побач з англійскім тэрмінам «навучанне на прыродзе» (*outdoor education*) і вельмі часта выкарыстоўваюць яго ў якасці сіноніма.

Курт Хан, асноўная дзейнасць якога здзяйснялася ў першай палове XX стагоддзя, распрацаваў і выкарыстоўваў свае навучальныя і выхаваўчыя праграмы як сродак барацьбы супраць назіраемых у штодзённым жыцці прыкмет заняпаду грамадства, такіх як

- абмежаванае праяўленне спачування;
- агульны заняпад фізічных здольнасцей і стану здароўя людзей;
- недахоп ініцыятывы і непасрэднай спантанасці;
- недахоп талерантнасці і гатоўнасці дапамагчы.

У разуменні Курта Хана прырода і культура з'яўляюцца першапачатковай і найбольш важнай часткай выхавання. Пры гэтым абавязковай перадумовай з'яўляецца сур'ёзнасць і рэальнасць сітуацыі. Канцэпцыя тэрапіі, заснаваная на перажыванні канкрэтных жыццёвых сітуацый, была скіравана на тое, каб «вылечыць» грамадства ад гэтых хвароб. Курт Хан імкнуўся прыцягнуць як мага больш маладых людзей да актыўнай адукацыйнай дзейнасці. Разам з іншымі педагогамі і грамадскімі дзеячамі ён арганізаваў некалькі адукацыйных цэнтраў, дзе праходзілі навучальныя курсы для моладзі ва ўзросце ад 16 да 20 год. Яго ідэі атрымалі падтрымку ў розных краінах свету і ў другой палове XX стагоддзя такія цэнтры працавалі больш чым у 40 краінах.

Навучанне ў такіх цэнтрах прадугледжвала наступныя віды дзейнасці:

- фізічныя трэніроўкі (у тым ліку лёгкая атлетыка, парусны спорт, грэбля, турыстычныя вандроўкі);
- праца ў службе дапамогі (напрыклад, у берагавой варце і альбо марской ці горнай ратаўнічай службе);
- праектная дзейнасць (вырашэнне цяжкіх, але выканальных задач, рашэнне якіх патрабуе самастойнага планавання, падрыхтоўкі і ажыццяўлення дзеянняў, звязаных з творчасцю і /альбо выкарыстаннем спецыфічных уменняў);
- экспедыцыя (па большасці шматдзённыя вандроўкі (водныя, горныя, палявыя і г.д.)). Тут размова ішла не толькі і не столькі пра заняткі спортам, але ў першую чаргу пра атрыманне практычнага досведу штодзённага жыцця на прыродзе (арганізацыя лагера, харчаванне і г.д.).

Курт Хан сцвярджаў, што эфектыўнасць тэрапіі, заснаванай на перажыванні вызначаных сітуацый, залежыць ад якасці перажывання кожнага канкрэтнага мерапрыемства (акцыі). Чым больш незвычайнымі з'яўляюцца перажыванні ўдзельніка, тым большы тэрапеўтычны эффект. Таксама ўспаміны, якія застаюцца ў памяці на доўгія гады, маюць пэўны тэрапеўтычны эфект і выступаюць пазней у якасці рэгулятараў пад час рознага кшталту жыццёвых выпрабаванняў.

## *3 "чырвоныя стужкі" тэорыі "навучання на прыродзе"*

Як значная колькасць псіхасацыяльных канцэпцый тэарэтычнае абгрунтаванне "навучання на прыродзе" з'яўляецца эклектычным наборам палажэнняў,

запазычаных з розных псіхалагічных, сацыяльных, экалагічных, палітычных, фізіялагічных і пост-мадэрністкіх тэорый.

Нягледзячы на гэта, у апошнія дзесяцігоддзі шмат якія даследчыкі звяртаюць увагу на дапрацоўку і далейшае развіццё тэарэтычнага абгрунтавання практыкі “навучання на прыродзе”, гэтая справа яшчэ далёка не завершаная. Праблемай тут з’яўляецца як значная шырыня тэарэтычнага поля, так і неабходнасць аналізу навуковых прац, створаных у розныя часы і ў розных культурных кантэкстах.

Для агульнага ўяўлення базавых тэарэтычных пастулатаў нам падаецца прыдатнай схема, прапанаваная аўстралійскім псіхолагам і даследчыкам Джеймсам Нейлам.

*1. Арыентацыя на досвед*

Практычна ва ўсіх тэарэтычных напрацоўках, прысвечаных “адукацыі на прыродзе”, значную ролю адыгрывае тэорыя эксперыментальнага навучання, заснаваная Джонам Дзьюі. Праца Дж. Дзьюі “Досвед і навучанне” (1938 г.) з’яўляецца да сённяшняга дня важнейшай крыніцай для тых, хто працуе над абгрунтаваннем эксперыментальнага навучання і адукацыі на прыродзе. Распрацаваная Джонам Дзьюі тэорыя адпавядае розным адукацыйным праграмам і разнастайнаму чалавечаму вопыту і на працягу больш чым 70 год з’яўляецца безумоўным лідэрам прагрэсіўнай педагогікі.

Аднак, якой бы папулярнай і карыснай не была тэорыя эксперыментальнага навучання Дзьюі, яна не дае дастаткова вычарпальных тлумачэнняў наконт узаемаадносінаў чалавека з навакольным асяроддзем.

*2. Арыентацыя на прыроду*

Другая “чырвоная стужка” ў канцэпцыі “адукацыі на прыродзе” – гэта тэорыя “глыбіннай экалогіі” і падыходы, арыентаваныя на ўмацаванне ўзаемасувязі чалавека і прыроды, на асэнсаванне індывідуумам свайго месца ў свеце. Шэраг тэарэтыкаў сцвярджае, што менавіта арыентацыя на прыроду і на непасрэднае ўзаемадзеянне з ёй з’яўляецца адметнай характэрнай рысай “адукацыі на прыродзе”. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў тэорыі Петера Марціна (Peter Martin) “прырода як сябар”.

*3. Арыентацыя на практыку, на шматмернасць*

Паслядоўнікі дадзенага падыходу сцвярджаюць, што абмежаванні тэорый глыбіннай экалогіі і эксперыментальнага навучання звязаныя базуюцца на недастатковай сувязі з практыкай. Значная колькасць груп і рухаў распрацавала свае асабістыя падыходы, цалкам заснаваныя на практычным досведзе і выпрацаваных рэкамендацыях. Яны распрацавалі свае шматмерныя практыка-тэарэтычныя мадэлі. Яны ўтрымліваюць крытычную камбінацыю апрабаваных на

практыцы кампанентаў і падкрэсліваюць 1) ролю чалавека, 2) ролю дзеянняў і паслядоўнай, лагічнай праграмы, 3) ролю навакольнага асяроддзя, 4) ролю выкладчыка/настаўніка і 5) ролю групы.

У падсумаванні можна сказаць, што стварэнне Джонам Дзьюі для прагрэсіўнай педагогікі тэарэтычнай платформы падштурхоўвае да распрацоўкі фундаментальнага тэарэтычнага абгрунтавання таксама і для адукацыі на прыродзе. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў шэраг даследчыкаў (Barret and Greenaway (1995), Beard and Wilson (2002), and Walsh and Golins (1976)) спрабуюць распрацаваць сістэму, якая будзе ўключаць розныя тэарэтычныя мадэлі, але гэты працэс яшчэ не завершаны.



# Мэты навучання на прыродзе

У розных педагагічных традыцыях галоўныя мэты навучання на прыродзе фармулююца по-рознаму. Напрыклад, у англасаксонскай традыцыі можна сустрэць наступнае апісанне мэтаў (К.Гільбертсон/K.Gilbertson):

1. Развіццё асобы і міжасабовых стасункаў (праца ў камандзе, паважлівыя адносіны, развіццё асабістых якасцей, працаздольнасць, добры настрой і задавальненне і г.д.)
2. Навучанне праз побыт на прыродзе і прыгоды (развіццё спартыўных здольнасцей, такіх як спартыўнае арыентаванне, плаванне, водныя, лясныя і горныя вандроўкі і інш.
3. Экалагічная адукацыя (развіццё пачуцця прыналежнасці да прыроды, падтрымка матывацыі да абароны і захавання навакольнага асяроддзя, распаўсюд метадаў і каштоўнасцей экалагічнага турызму).

Даволі цікавую класіфікацыю мэтаў распрацавалі Прыст і Гас (Priest and Gass). Яны прапануюць адрозніваць мэты ў залежнасці ад тыпу і галоўнай накіраванасці праграм, якія праводзяцца ў прыродных умовах. Адпаведна імі была прапанавана наступная класіфікацыя:

- Праграмы адпачынку і вольнага часу, у асноўным скіраваныя на змену і развіццё сферы пачуццяў асобы.
- Адукацыйныя праграмы маюць на мэце змяняць спосабы адчуванняў і мыслення.
- Мэта развіваючых праграм – змяняць спосаб адчуванняў, мыслення і паводінаў.
- Тэрапеўтычныя праграмы развіваюць сферу пачуццяў, спосабы мыслення, паводзінаў і развіваюць псіхалагічную стабільнасць і ўстойлівасць.

Навучанне на прыродзе аб'ядноўвае ў сваёй структуры тры галоўныя кампаненты: *асоба, група людзей і свет прыроды*. У залежнасці ад канкрэтнага віду дзейнасці акцэнт змяшчаецца ў бок аднаго з кампанентаў. Такім чынам, навучанне на прыродзе можа быць скіравана на

- ✓ фармаванне ўменняў выжывання ва ўмовах дзікай прыроды;
- ✓ развіццё здольнасці вырашэння праблем;
- ✓ скарачэнне правапарушэнняў (найперш, рэцыдываў);
- ✓ удасканаленне працы каманды;
- ✓ развіццё лідэрскіх і камунікатыўных якасцей;
- ✓ разуменне прыродных працэсаў;

- ✓ развіццё духоўнасці, адказнасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі;
- ✓ развіццё фізічных сіл і здольнасцей чалавека;
- ✓ і інш.

Нам вельмі падабаецца таксама пералік мэтаў, з якімі нас пазнаёмілі нашы калегі па нефармальнай адукацыі – прадстаўнікі шведскіх скаўтскіх арганізацый. Гэта так званы Скаўцкі трохкутнік.

### *Скаўцкі ЭКА-трохкутнік*




Трохкутнік сімвалічна паказвае, як асоба развівае свае ўяўленні і каштоўнасці, што тычацца прыроды і навакольнага асяроддзя. Тры бакі трохкутніка ўяўляюць сабой тры часткі скаўцкай методыкі – знаходжанне на свежым паветры, малая група і навучанне праз дзеянне. Форму трохкутніка можна таксама разглядаць як стралу, якая вядзе да адчування, разумення прыроды.

### *Знаходзіцца на прыродзе і атрымліваць асалоду*

Аснова трохкутніка тая ж, што і аснова адчування прыроды ў цэлым. Яго можна атрымаць толькі праз знаходжанне на прыродзе. Каб мець магчымасць

атрымоўваць асалоду ад знаходжання на прыродзе, нашы асноўныя патрэбы павінны быць задаволены. Гутарка ідзе пра тое, каб быць сухім, у цяпле і адчуваць сябе ў бяспецы. Скаўцкая праграма змяшчае дастаткова шмат тэхнічных ведаў, што тычацца знаходжання на прыродзе. Скаўты павінны навучыцца выжываць дастаткова доўгі час у параўнальна прымітыўных умовах: умець развесці вогнішча, каб сагрэцца, гатаваць ежу на свежым паветры, каб быць сытым, уладкоўваць заслону ад ветру, каб было дзе спаць.

### *Убачыць і зрабіць адкрыццё*

Наступны крок у трохкутніку – гэта ўбачыць і зрабіць адкрыццё. Той, хто больш не заняты сваімі мокрымі нагамі і голадам, можа, нарэшце, усімі пачуццямі пачаць заўважаць, успрымаць прыроду. Важна не трапіць у адукацыйную пастку і паверыць, што навучыць можна толькі з дапамогай кніг, наадварот – павінны быць задзейнічаны ўсе органы пачуццяў.

### *Разумець кантэкст*

Цікавасць вядзе да ўзнікнення жадання ведаць больш. Мы робім высновы з таго, што ўбачылі і адкрылі на папярэднім этапе. Тут гаворка ідзе пра тое, як функцыянуе прырода, і пра тое, што ўсё ўзаемазвязана без умяшальніцтва чалавека.

### *Разумець масштабы ўздзеяння*

На гэтым этапе скаўты даведваюцца пра тое, як чалавек уплывае на прыроду. Яны разумеюць, да якіх наступстваў могуць прывесці розныя тыпы ўздзеяння чалавека на навакольнае асяроддзе.

### *Уплываць*

Той, хто дайшоў так далёка па ступенях трохкутніка, ужо можа самастойна атрымліваць тыя веды, якія неабходны для таго, каб пазітыўна ўплываць на навакольнае асяроддзе. Тое, што з'яўляецца правільным, вызначаецца зыходзячы з уласных ведаў і меркаванняў асобы. Менавіта каштоўнасці асобы кіруюць паводзінамі чалавека. Гэта прыводзіць да жадання аказаць уздзеянне на іншых і фармавання сваёй асабістай пазіцыі па пытаннях навакольнага асяроддзя.

*Важна памятаць, што тыя этапы, якія знаходзяцца ў аснове трохкутніка, павінны прысутнічаць заўсёды. Самае важнае ў трохкутніку – гэта аснова.*

### *Перанос вопыту ў штодзённае жыццё*

Найбольш важны фактар навучання на прыродзе – гэта магчымасць пераносу (трансфера) набытага вопыту ў штодзённае жыццё. Адрозніваюць тры віды трансфера:

- *змястоўны*: канкрэтныя мадэлі паводзінаў і набытыя веды робяцца «ўласнымі», засвоенымі і выкарыстоўваюцца таксама ў іншых падобных сітуацыях (напрыклад, уменне страхаваць пры ўдзыме ў горы можа быць выкарыстана таксама пад час спуску з гары па канаце);

- *надзмястоўны*: спецыфічны вопыт абагульняецца і пераўтвараецца ва ўстаноўкі, прынцыпы, мадэлі паводзінаў. Пераносяцца не канкрэтныя ўменні, а базавыя прынцыпы. (Напрыклад, стратэгіі вырашэння праблем і пераадольвання канфліктных сітуацый, апрабаваныя пад час навучання на прыродзе, пераносяцца ў штодзённае жыццё.)
- *метафарычны*: пад час навучання мадэлююцца сітуацыі, аналагічныя тым, што адбываюцца ў штодзённым жыцці. Набыты пад час такой актыўнасці вопыт, вядзе да змены канткрэтнага стэраатыпу паводзінаў. Перанос вопыту адбываецца альбо под час рэалізацыі падобнай сітуацыі, альбо ў час рэфлексіі непасрэдна пасля правядзення актыўнасці.

Перанос вопыту ў штодзённае жыццё з'яўляецца цэнтральнай праблемай і задачай навучання на прыродзе. Таму патрэбна ўлічваць (і па магчымасці папярэджваць) наступныя перашкоды:

- ✓ жыццёвыя сітуацыі звычайна больш складаныя, чым змадэляваныя;
- ✓ кароткатэрміновыя педагагічныя мерапрыемствы не могуць даць доўгатэрміновага навучальнага эффекту;
- ✓ бывае, што ўдзельнікі, якія патрабуюць дапамогі ў пераносе вопыту, яе не атрымліваюць;
- ✓ тое, што адукацыйнае мерапрыемства ўспрымаецца як нешта штучнае, часам як адпачынак, стварае дадатковую блакіроўку для пераносу вопыту ў паўсядзённае жыццё.

Пераносу вопыту спрыяюць

- ✓ абмеркаваныя і ўзгодненыя мэты мерапрыемства,
- ✓ агучаныя чаканні ўдзельнікаў,
- ✓ прадуманы падзел на групы,
- ✓ папярэдняя грунтоўная падрыхтоўка мерапрыемства,
- ✓ якасны аналіз праведзенай працы,
- ✓ і асэнсаванае выкарыстанне тэхнік трансфера вопыту ў штодзённае жыццё.



# Эфектыўнасць адукацыйных праграм у прыродных умовах

Эфектыўнасць навучання на прыродзе атрымлівае вельмі пазітыўную ацэнку ў вялікай колькасці апісання практык і рэфлексій. Настаўнікі, напрыклад, часта падкрэсліваюць, што пад час такога кшталту праграм іх адносіны з навучэнцамі значна паляпшаюцца. Дадзеныя аналізу шэрагу эмпірычных даследаванняў пацвярджаюць, что праграмы навучання на прыродзе, заснаваныя на асабістых перажываннях, аказваюць станоўчы ўплыў на развіццё самаацэнкі, лідэрскіх і камунікатыўных дадзеных. Варта ўзгадаць таксама, што па выніках даследаванняў эфектыўнасць навучальных праграм, праведзеных па-за будынкам увесь час павышаецца, у той час як эфектыўнасць традыцыйных форм – зніжаецца.

Аднак, нягледзячы на шматлікія сведчанні на карысць навучальных праграм у прыродных умовах, мы не ў стане дакладна акрэсліць адукацыйныя эфекты і дасягнутыя поспехі. Што і як спрацоўвае пад час такога навучання? Чаму гэта адбываецца так, а не інакш? Што гарантуе такія вынікі?..

«Чорная скрынка» адукацыі на прыродзе яшчэ чакае сваіх вынаходцаў і тэарэтыкаў, якія здолеюць дэталёва апісаць навучальныя працэсы і адказаць на шэраг пытанняў, якія застаюцца адкрытымі.



# Формы і метады навучання на прыродзе

Дзеля дасягнення сваіх спецыфічных мэтаў адукацыя на прыродзе выкарыстоўвае шэраг вельмі разнастайных форм і метадаў дзейнасці, як запазычаных, так і распрацаваных спецыяльна для навучання па-за межамі будынкаў. У значнай ступені выбар форм і метадаў залежыць ад базавай мадэлі, выкарыстанай пад час распрацоўкі праграм.

Так, напрыклад, Рон Ватэрс (Ron Watters) прапаноўвае выдзяляць наступныя базавыя мадэлі праграмавання актыўнасці і навучання на прыродзе

| Мадэль | Характэрныя элементы |
|---|---|
| Клубная | Статут клуба альбо палажэнне. Наяўнасць лідэра. Звычайна патрабуе фіксаванага сяброўства |
| Інстуктарская альбо школьная | Інструктар альбо настаўнік, якія вядзе заняткі, семінары ці практыкумы |
| Экскурсійная | Наяўнасць экскурсавода ці правадніка, які праводзіць сваіх гасцей ці ўдзельнікаў па маршруе |
| «Агульная прыгода» | Няма аб’яўленага (фармальнага) лідэра. Удзельнікі падзяляюць паміж сабой абавязкі па распрацоўцы і рэалізацыі запланаванай актыўнасці. |

Прапануемыя ў межах гэтых мадэлей праграмы могуць быць як кароткатэрміновымі (да 2 гадзін), так і доўгатэрміновымі (ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў). Гэта могуць быць як асобныя разавыя праграмы, так і набор асобных падзей, звязаных паміж сабой. Варта адзначыць, што праграмы навучання на прыродзе вельмі добра стыкуюцца з іншымі формамі навучання і могуць быць часткай праграмы, у якой аб’ядноўваюцца розныя, у тым ліку і традыцыйныя (школьныя, універсітэцкія, грамадскія) навучальныя курсы.

### *Формы адукацыі на прыродзе*

| Форма | Пплюсы | Мінусы |
|---|---|---|
| Стацыянарны летнік (экалагічны, спартыўны, валанцёрскі) | Нізкі ўзровень коштаў, стацыянарны, дазваляе планаваць дадатковую актыўнасць і паслядоўную праграму<br>уцягнутасць удзельнікаў і лідэраў у забеспячэнне штодзённага жыцця | Часткова сфакусаваны на адпачынку, ізаляцыя, патрабуе больш-менш капітальных пабудоў |

| | | |
|---|---|---|
| Экскурсіі | Вялікі аб’ём інфармацыі | Пасіўнасць удзельнікаў |
| Экспедыцыя/вандроўка, скіраваная на прыгоды і перажыванні | Фокус на развіццё эмацыйнай сферы, магчымы тэматычныя аспекты | Малы пазнавальны эфект, адсутнічае сувязь з праграмай |
| Экспедыцыя/вандроўка навукова-даслечага характару | Звязаная з іншай праграмай навучання, стварае дадатковыя выклікі і прастору для інтэлектуальнага развіцця | Патрабуе значнай змястоўнай падрыхтоўкі, дадатковыя патрабаванні да лідэра як да эксперта |
| Спартыўныя экпедыцыі/вандроўкі (водныя, горныя і г.д.) | Развівае спартыўныя здольнасці, камандны дух | Значныя патрабаванні да абсталявання, да кваліфікацыі лідэра/інструктара, да фізічнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў |
| Сацыяльныя экспедыцыі (напр.дапамога сталым людзям на весцы і інш.) | Добрыя сувязі з грамадствам, вывучэнне сацяльных праблем, развіццё этычнай і эмацыйнай сфер | Добрая падрыхтоўка, патрэбна папярэдняе вывучэнне праблем, з якімі можна сутыкнуцца |
| Гарадскія экспедыцыі (напрыкл., аднадзённыя з тэматычным фокусам) | Нізказатратныя, маюць дапаўняльны характар да іншых заняткаў, сувязі з мясцовай супольнасцю | Слабая сувязь з прыродай |
| Ролевыя гульні на прыродзе | Развіццё эмацыйнай сферы, вывучэнне той ці іншай тэмы праз асабістае “пражыванне” | Значная падрыхтоўчая праца, магчымы высокі ўзровень выдаткаў |
| Семінары, воркшопы | Арганізаваны навучальны працэс, арыентацыя на дасягненне мэтаў | Заарганізаванасць, адарванасць ад штодзённага кантэксту |
| Выезды на фермы, аграгаспадаркі (агратурызм) | Вывучэнне рэальнага жыцця | Арыентацыя на адпачынак |
| Лэнд-арт | Развіццё творчых здольнасцей, папулярызацыя прыроды, развіццё матывацыйнай і эмацыйнай сферы | Падтрабуе часу, падабранага ландшафту, “кароткае жыццё” твораў |
| Фестывалі і іншыя імпрэзы | Шырокі тэматычны спектр, магчымасць уцягнуць удзельнікаў з розным | Падтрабуе патрыхтоўкі, значных матэрыяльных укладанняў, экалагічная |

| | | |
|---|---|---|
| | узроўнем. | рызыка – забруджанне навакольнага асяроддзя |



## Дадатак 1. Апісанне выбраных метадаў

**Прапануемыя ў дадзеным зборніку метады могуць быць выкарыстаны дзеля:**

- навучання спосабам выжывання ва ўмовах дзікай прыроды (гатаванне ежы, развядзенне вогнішча, пабудова мэблі з матэрыялаў навакольнага асяроддзя, арыентаванне на новым месцы і г.д.),
- удасканальванне звычак працы ў групе,
- разуменне прыродных працэсаў,
- даследаванне ўздзеяння антрапалагічнага фактару.

## Спіс метадаў:


Рытуалы вітання ....................................................17
Zip-zap-zup ....................................................18
Асацыяцыі з элементамі прыроды ....................................................19
Састаўленне мапы мясцовасці ....................................................19
Змяя ....................................................20
Антрапагенны фактар ....................................................20
Сасіскі, кетчуп, кока-кола ....................................................21
Лэнд-арт ....................................................21
Сцежка адчуванняў ....................................................22
Павуцінка ....................................................23
Адказнасць за Зямлю ....................................................24
Лясныя скарбы ....................................................25
У пошуках скарбаў ....................................................25
Гукавая карта наваколля ....................................................26


### Рытуалы вітання

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | у памяшканні / на прыродзе |
| *час правядзення:* | каля 10 - 15 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 8 чал (лепш за ўсё цотная колькасць удзельнікаў) |
| *мэта / тэма:* | удасканальванне звычак працы ў групе / знаёмства, устанаўленне прыемнай атмасферы ў групе, разняволенне ўдзельнікаў |
| *матэрыялы:* | папера, асадка |

| | |
|---|---|
| *падрыхтоўка:* | па колькасці ўдзельнікаў трэба падрыхтаваць карткі з напісанымі рытуаламі вітання. Кожны рытуал трэба напісаць на дзьвух картках, такім чынам два ўдзельніка будуць вітаць другіх згодна з адным і тым жа рытуалам. |

*Апісанне актыўнасці:*

Карткі трэба перамяшаць і раздаць удзельнікам. Па ўмоўнаму знаку ўдзельнікі пачынаюць вітаць адно аднаго ў адпаведнасці з рытуалам, напісаным на іх картцы, і павінны такім чынам знайсці сваю пару. Потым карткі перамешваюцца і зноў раздаюцца ўдзельнікам.

*Прыклады рытуалаў:*

паціснуць руку (па-нямецку), пацалаваць у шчаку (па-французску), нахіляцца са складзенымі далонямі (па-індыйску), пацерціся насамі (як эскімосы); прысесці, паставіць рукі на калені, нахіляцца і казаць “ос”(як змагар сумо); вітаць словам “шалом” і правай рукой правесці ад ілба да пупка (па-ўсходняму); дакрануцца знешнімі паверхнямі далоней, правесці да сябе, дакрануцца ўнутранымі паверхнямі далоней, правесці да сябе, дакрануцца кулакамі зверху, знізу, пстрыкнуць пальцамі (як крутыя пацаны).

### Zip-zap-zup

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе, у памяшканні |
| *час правядзення:* | 10 - 15 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 8 чал. |
| *мэта / тэма:* | удасканаленне звычак працы ў групе / устанаўленне прыемнай атмасферы ў групе, разняволенне ўдзельнікаў |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

удзельнікі становяцца ў круг. Гульня заключаецца ў тым, што ўдзельнікі перадаюць адно аднаму “імпульс”. Ёсць імпульсы трох тыпаў: зіп, зап і зуп. Спачатку вядучы паказвае першы імпульс “зіп”: пляскае ў далоні, адной рукой выразна паказвае на ўдзельніка, які знаходзіцца справа ад вядучага, і гучна выкрыквае “зіп!”. Яго сусед працягвае перадаваць “імпульс” па кругу. Потым вядучы паказвае наступны тып “імпульса” – “зап”. Гэты “імпульс” перадаецца ў левы бок. Пасля таго як усе ўдзельнікі паспрабавалі гэты “імпульс”, вядучы паказвае наступны – “зуп”. Ён перадаецца як заўгодна да любога ўдзельніка ў крузе акрамя суседзей справа і злева. Наступны элемент – “bang!“, з яго дапамогай можна адбіваць “імпульс”: удзельнік засланяецца рукамі са сціснутымі кулакамі і гучна выкрыквае “бэнг!” , такім чынам “імпульс” вяртаецца да таго, хто яго

адправіў. Мэта гульні – не зблытацца з тыпамі “імпульсаў”. Удзельнікі, якія памыляюцца і не правільна рэагуць на “імпульс”, выходзяць з круга.

*Заўвага*: важна, каб удзельнікі насамрэч змаглі разняволіцца і таму гучна выкрыквалі назвы “імпульсаў” і пляскалі ў далоні.

## Асацыяцыі з элементамі прыроды

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе |
| *час правядзення:* | каля 20 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 4 чал |
| *мэта / тэма:* | удасканаленне звычак працы ў групе, разуменне прыродных працэсаў / знаёмства, разуменне сувязі з навакольным асяроддзем |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

удзельнікі становяцца ў круг, мадэратар прапаноўвае ўсім пазнаёміцца незвычайным спосабам: знайсці за 5 хвілін які-небудзь прадмет у бліжэйшым асяроддзі (гэта можа быць галінка, кветка, камень і г.д.), які на думку ўдзельнікаў найбольш поўна характарызуе іх або адлюстроўвае іх настрой на дадзены момант. Калі ўсе ізноў вяртаюцца ў круг, мадэратар прапаноўвае ўдзельнікам расказаць пра сябе і пра тое, чаму яны выбралі менавіта гэты прадмет, як ён звязаны з іх асобай, іх настроем у дадзены момант.

## Састаўленне мапы мясцовасці

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе, лепш за ўсё ў незнаемай мясцовасці |
| *час правядзення:* | каля 30 - 60 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | Любая |
| *мэта / тэма:* | навучанне спосабам выжывання ва ўмовах дзікай прыроды, удасканаленне звычак працы ў групе / арыентацыя на мясцовасці, знаёмства з новым асяроддзем |
| *матэрыялы:* | папера, фламастэры |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

Мадэратар прапаноўвае групе з 3-5 чалавек (ці некалькім групам па 3–5 чал) саставіць мапу бліжэйшай тэрыторыі, адзначыць на ёй найбольш важныя “стратэгічныя аб’екты” (дарога, возера, крама, пошта і г.д.). Прадставіць вынікі сваіх даследаванняў – крэатыўна аформленую мапу – можна ўвечары каля вогнішча.

### Змяя

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | у памяшканні / на прыродзе |
| *час правядзення:* | каля 15 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 8 чал |
| *мэта / тэма:* | удасканаленне звычак працы ў групе / устанаўленне пазітыўнай атмасферы ў групе |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

Усе ўдзельнікі становяцца ў круг, вядучы ў цэнтры. Са словамі: "Я змяя, змяя, змяя. Будзеш ты маім хвастом?" ён ідзе па кругу і, скончваючы выраз, спыняецца насупраць аднаго з удзельнікаў, шырока расставіўшы ногі. Удзельнік прапаўзае ў яго пад нагамі і становіцца "хвастом" змяі: чапляецца за вядучага і ідзе разам з ім па кругу. Вядучы ізноў кажа: "Я змяя, змяя, змяя. Будзеш ты маім хвастом?" і супыняецца насупраць наступнага ўдзельніка, які прапаўзае ўжо пад нагамі вядучага і папярэдняга ўдзельніка. Такім чынам, вядучы збірае ўсіх удзельнікаў. Калі гуляючых больш за 10 чалавек, то пакуль апошні ўдзельнік паўзе пад нагамі астатніх, вядучы можа замкнуцьт круг з "хвастом" змяі, і апошні ўдзельнік будзе паўзці па кругу, пакуль не здагадаецца, што круг замкнуты ☺

### Антрапагенны фактар

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе |
| *час правядзення:* | каля 30 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 6 чал (важна цотная колькасць удзельнікаў) |
| *мэта / тэма:* | удасканаленне звычак працы ў групе, даследаванне ўздзеяння антрапалагічнага фактару / разуменне ўздзеяння чалавека на навакольнае асяроддзе, эстэтычнае ўспрыманне прыроды, праца ў пары, устанаўленне даверу да партнёра |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

мадэратар прапануе ўдзельнікам раздзяліцца на пары. Адзін партнёр можа хадзіць толькі з зачыненымі вачыма, другі вядзе яго па мясцовасці і робіць усяго шэсць прыпынкаў, на якіх "сляпы" адкрывае вочы. Першыя тры прыпынкі робяцца ў тых месцах, дзе відавочны вынік уздзеяння чалавека на навакольнае асяроддзе – антрапагенны фактар; іншыя тры – дзе можна ўбачыць нешта вельмі прыгожае (кветка, дрэва, від на возера і г.д.). Пасля партнёры мяняюцца ролямі, і вядучым становіцца той, хто быў "сляпым".

### Сасіскі, кетчуп, кока-кола

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе |
| *час правядзення:* | 5 - 7 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 5 чал |
| *мэта / тэма:* | удасканаленне звычак працы ў групе / устанаўленне пазітыўнай атмасферы ў групе, больш цесны кантакт паміж удзельнікамі |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

удзельнікі становяцца ў круг адзін за адным і трымаюцца за плечы таго, хто стаіць уперадзе. Вядучы распавядае гісторыю: “Мы вельмі галодныя і ідзем у краму. І хочам там набыць … сасіскі, кетчуп, кока-колу, сасіскі, кетчуп, кока-колу, сасіскі, кетчуп, кока-колу. (на словах “сасіскі, кетчуп, кока-кола” усе пачынаюць рабіць рухі, як быццам танцуючы ламбаду: спачатку падымаюць правую нагу, потым левую, і потым прысядаючы робяць кругавыя рухі тазам). На вуліцы зіма, нам вельмі холадна, таму мы прыціскаемся адно да аднаго (удзельнікі становяцца бліжэй адно да аднаго, абдымаюць свайго суседа спераду за талію) і ідзем у краму хутчэй, каб набыць … сасіскі, кетчуп, кока-колу, сасіскі, кетчуп, кока-колу, сасіскі, кетчуп, кока-колу. Ну вось, мы прыйшлі ў краму, паелі і зараз ідзем дадому. Якія ж смачныя былі … сасіскі, кетчуп, кока-кола, сасіскі, кетчуп, кока-кола, сасіскі, кетчуп, кока-кола” (група ідзе спіной уперад).

### Лэнд-арт

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе (на вуліцы, у лесе, на беразе рэчкі г.д.) |
| *час правядзення:* | 30 – 60 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 5 чал |
| *мэта / тэма:* | разуменне прыродных працэсаў / эстэтычнае ўспрыманне прыроды, узаемадзеянне з прыродай, устанаўленне гарманічных адносін з наваколлем |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | можна загадзя падрыхтаваць інфармацыйны матэрыял пра канцэпцыю Лэнд-арт, фотаздымкі былых работ (напрыклад, вядомых Лэнд-арт-мастакоў), каб інспіраваць удзельнікаў да актыўнасці, падказаць некаторыя ідэі. |

*Апісанне актыўнасці:*

мадэратар прапаноўвае ўдзельнікам “пагуляць” з прыродай, выразіць сябе, свой настрой, сваё светаўспрыманне праз крэатыўную кампазіцыю, выкарыстоўваючы ўсе магчымыя матэрыялы, якія знаходзяцца ў наваколлі.

*Падрабязней пра Лэнд-арт гл. у дадатку 2.*

## Сцежка адчуванняў

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе |
| *час правядзення:* | |
| *колькасць удзельнікаў:* | Любая |
| *мэта / тэма:* | удасканаленне звычак працы ў групе, разуменне прыродных працэсаў / узаемадзеянне з прыродай, адчуванне элементаў прыроды незвычайным спосабам |
| *матэрыялы:* | прыродныя матэрыялы, такія як трава, шчэпкі, зямля, мох і г.д. |
| *падрыхтоўка:* | загаддзя трэба прадумаць, як будзе выглядаць сцежка адчуванняў, дзе размяшчацца, якую форму мець (напрыклад, проста прамая сцежка або закручаная спіраллю), чым можна аддзяліць сектары (дошчачкі або галінкі) |

*Апісанне актыўнасці:*

Мадэратар прапаноўвае ўдзельнікам абмеркаваць, як будзе выглядаць сцежка адчуванняў, намаляваць план, прадумаць, колькі ў сцежцы будзе сектароў, якія прыродныя матэрыялы можна выкарыстаць. Потым усе разам робяць сцежку. Час пабудовы сцежкі залежыць ад таго, наколькі добра група падрыхтавалася.

Калі сцежка гатова, удзельнікі па аднаму могуць прайсці па сцежцы адчуванняў: без абутку (лепш басанож) і з зачыненымі вачыма.

Потым у групе можна абмеркаваць адчуванні ўдзельнікаў.

Прыклады планаў сцежкі адчуванняў:




**Павуцінка**

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе |
| *час правядзення:* | 10 -15 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 7 чал . |
| *мэта / тэма:* | разуменне прыродных працэсаў / разуменне такіх паняццяў, як экасістэма, харчовая сетка, раўнавага ў прыродзе, устанаўленне гарманічных адносін з наваколлем |
| *матэрыялы:* | клубок нітак |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

Часам мы не разумеем, што ў прыродзе ўсё, жывое і нежыое, ўзаемазвязана. Калі папуляцыя аднаго віда раслінаў ці жывёлаў будзе значна пашкоджана або вынішчана, гэта паўплывае на шэраг узаемасувязей у прыродзе. Гэта як быццам патузаць павуцінку за адну нітачку – варушыцца пачынаюць усе яе ніткі.

Удзельнікі становяцца ў круг, адзін з іх трымае клубок нітак і пачынае гульню. Ён кажа, напрыклад: “Я – дуб. На мне жыве вавёрка”, адзін канец ніткі трымае ў руцэ, а клубок кідае наступнаму ўдзельніку (вавёрцы). “Вавёрка” працягвае: “Я – вавёрка і люблю арэхі”, трымаецца за нітку і кідае клубок далей “арэшніку”. Такім чынам клубок перадаецца да ўсіх удзельнікаў, да жабы, чарвяка, бусла і г.д. (па харчовай сетцы), пакуль усе ўдзельнікі не будуць “звязаны”, некаторыя нават па некалькі разоў.

Што здарыцца, калі лесаруб зрубіць дуб? Ён не толькі знішчыць дрэва, але і паўплывае на жыццё ўсіх арганізмаў, якія з ім звязаны.

*Заўвага*:

мадэратар павінен звяртаць увагу ўдзельнікаў на сувязь паміж жывой і нежывой прыродай (няхай удзельнікі ўключаюць у харчовую сетку таксама зямлю, паветра, ваду);

мадэратар можа задаваць розныя пытанні, напрыклад:

што здарыцца, калі лесаруб зрубіць адно дрэва? а калі цэлы лес?

што здарыцца, калі будзе высушана балота? і г.д.

**Адказнасць за Зямлю**

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе, у памяшканні |
| *час правядзення:* | 10 -15 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | ад 5 чал. |
| *мэта / тэма:* | разуменне прыродных працэсаў, даследаванне ўздзеяння антрапалагічнага фактару |
| *матэрыялы:* | мяч (у выглядзе глобуса), папера, асадкі (фламастэры) |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

Напачатку гульні кожны ўдзельнік занатоўвае свае аргументы, чаму ён не адказны за Зямлю (напрыклад, у мяне няма машыны, я эканомлю ваду, купляю ўсё толькі “экалагічнае” і г.д.), побач на тым жа аркушы паперы ён піша, чаму ён адказвае за стан прыроды (карыстаюся аўтамабілем, не выключаю святло, пакідаю смецце ў лесе пасля пікніка і г.д).

Удзельнікі становяцца ў круг. Вядучы бярэ ў рукі мяч-Зямлю і кажа: “Я – хворая Зямля. Мае лясы засыхаюць, памяншаецца колькасць раслін і жывёл. Я – твая другая маці, мае палі і лясы даюць табе ежу, мая вада дае табе жыццё. Я хворая і мне патрэбна твая дапамога. Калі я памру, памрэ ўсё. Дапамажы мне!”

Вядучы кідае мяч аднаму з удзельнікаў, які адказвае: “Я не вінаваты ў гэтым і не адказны за гэта, я не магу табе дапамагчы, таму што...” – і называе адзін са сваіх аргументаў. Пасля таго як мяч пабываў ва ўсіх ўдзельнікаў па некалькі разоў, вядучы ізноў кідае мяч каму-небудзьб з круга. Цяпер удзельнікі адказваюць: “Так, я адказваю за гэта, я вінаваты, таму што...” і пералічваюць усё, што яны зрабілі, што можа пашкодзіць навакольнаму ассяроддзю. “Але я хачу дапамагчы табе, а менавіта тым, што...” – і называе формы дапамогі.

Пасля гульні добра арганізаваць дыскусію і спытаць удзельнікаў, як яны сябе адчувалі, калі адмаўляліся дапамагчы Зямлі, і як змяніліся пачуцці ўдзельнікаў, калі яны згаджаліся дапамагчы.

**Лясныя скарбы**

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе (лепш за ўсё ў лесе) |
| *час правядзення:* | 15 - 20 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | Любая |
| *мэта / тэма:* | навучанне спосабам выжывання ва ўмовах дзікай прыроды / разуменне сувязі з навакольным асяроддзем |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

Апісанне актыўнасці:

мадэратар прапануе ўдзельнікам за пэўны час (10 хвілін) знайсці ў наваколлі адну ежавую рэч, адну трутную, адну лекавую, адну рэч, якая апісана ў народных казках. Потым удзельнікі збіраюцца разам і абмяркоўваюць вынікі сваіх пошукаў.

**У пошуках скарбаў**

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе |
| *час правядзення:* | 5 - 10 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | Любая |
| *мэта / тэма:* | навучанне спосабам выжывання ва ўмовах дзікай прыроды / вызначэнне бакоў свету па мясцовых прадметах, арыентацыя на мясцовасці |
| *матэрыялы:* | Няма |
| *падрыхтоўка:* | загадзя падрыхтаваць “скарб”, размясціць яго і падрыхтаваць апісанне яго месцазнаходжання адносна, напрыклад, месца вогнішча групы ці палаткі (напрыклад, ад … 10 крокаў на поўнач, 3 крокі на захад); абмеркаваць з удзельнікамі, якія існуюць спосабы вызначэння бакоў свету па мясцовых прадметах |

Апісанне актыўнасці:

мадэратар прапануе ўдзельнікам знайсці “скарб” і раздае групам апісанне яго месцазнходжання, якое ўключае ў сябе вызначэнне бакоў свету. Выйграе той удзельнік (ці тая група ўдзельнікаў), які хутчэй за астатніх знойдзе скарб.

Некаторыя прыкметы для вызначэння бакоў свету:

*- кара большасці дрэваў больш грубая і цёмная з паўночнага боку. Дрэвы, якія растуць асобна, з паўночна-заходняга боку пакрыты імхом, нахілены на поўдзень, з паўднёвага боку галіны больш доўгія і ўся крона больш бухматая і густая*

*- гадавыя кольцы на пнях дрэваў гусцей з паўночнага боку*

*- мурашнікі размяшчаюцца з паўднёвага боку дрэваў, пнёў, кустоў. Акрамя таго, паўднёвы схіл мурашнікаў пакаты, а паўночны стромкі*

*- алтары праваслаўных і лютэранскіх цэркваў накіраваны на ўсход, а галоўны ўваход размяшчаецца з заходняга боку*

*- прыпадняты канец ніжняй папярочкі крыжа цэркваў накіраваны на поўнач.*

### Гукавая карта наваколля

| | |
|---|---|
| *месца, умовы правядзення:* | на прыродзе |
| *час правядзення:* | 10 - 20 хв. |
| *колькасць удзельнікаў:* | Любая |
| *мэта / тэма:* | разуменне прыродных працэсаў / узаемадзеянне з прыродай, эстэтычнае ўспрыманне прыроды |
| *матэрыялы:* | аркушы паперы, асадкі па колькасці ўдзельнікаў |
| *падрыхтоўка:* | Няма |

*Апісанне актыўнасці:*

Ці шмат мы заўважаем, калі знаходзімся, напрыклад, у лесе? Якія гукі мы чуем навокал нас? Чым адрозніваюцца гукі лесу ад гукаў, якія мы можам пачуць на беразе рэчкі ці калі мы знаходзімся каля дарогі?

Мадэратар прапаноўвае ўдзельнікам зрабіць гакавую карту наваколля. Для гэтага ўсе разыходзяцца па тэрыторыі і напрацягу 10 хвілін канцэнтруюцца на гуках, якія яны чуюць навокал, і занатоўваюць іх на аркушы паперы (гэта могуць быць крэатыўныя малюнкі). Потым удзельнікі абмяркоўваюць, якія гукі яны пачулі.

# Дадатак № 2. Лэнд-арт

**Лэнд-арт** (ад англ. land art – зямельнае мастацтва), кірунак у выяўленчым мастацтве апошняй трэці XX ст, які грунтуецца на выкарыстанні рэальнага краявіду ў якасці мастацкага матэрыялу і аб'екта.

Мастакі рыюць траншэі, ствараюць мудрагелістыя нагрувашчванні камянёў, размалёўваюць скалы... Звычайна для сваіх акцый яны выбіраюць бязлюдныя месцы – дзікія ландшафты - і спрабуюць тым самым як быццам бы вярнуць мастацтва ў прыроду. Дзякуючы свайму «першабытнаму» выгляду шматлікія акцыі і аб'екты такога кшталту зблiжаюцца з археалогіяй, а таксама з фота-артам, таму што большасць людзей можа ўбачыць іх толькі на фотаздымках.



**Рычард Лонг, Пяць сцежак**
**NEW ART CENTRE ROCHE COURT, Англі**

Тэрмін «**лэнд-арт**» з'явіўся напрыканцы 60-х. Мастацкі свет у той час пратэставаў супраць традыцыйных асноваў. Само існаванне рынкавай сістэмы падвяргалася сумненню, а традыцыйныя музеі і галерэі не ўспрымаліся ўсур'ёз. Карціны былі проста такім жа таварам, як і любыя іншыя рэчы. Традыцыйнае мастацтва памёрла. Зварот да рэалізму трэба ўспрымаць як імкненне да высвабаджэння, як жаданне адчуваць па-іншаму. Гэта было імкненне пераглядзець адносіны з прыродай.

Назва **лэнд-арт** выкарыстоўваецца для таго, каб аб’яднаць вялізарны дыяпазон мастацкіх праектаў розных людзей з рознымі поглядамі на мастацтва. Напрыклад, англійскі мастак **Рычард Лонг** з дапамогай бульдозераў ажыццяўляў крупнамасштабныя праекты, галоўная мэта якіх – увекавечыць у прыродзе які-небудзь грандыёзны помнік. Другія прадстаўнікі лэнд-арта падарожнічалі па свеце пешшу, ствараючы на сваім шляху эфемерныя скульптуры, зробленыя з “падножнага” матэрыялу – камянёў, гразі, раслін і вады. Адзінай памяццю аб гэтых вандроўках застаюцца фотаздымкі тых работ, якія, магчыма, выпадкова ўбачаць наведвальнікі лесу, а можа яны растануць пад мокрым кастрычніцкім дажджом, так нікім і не ўбачаныя.



**Джэймс Туррэл, кратэр Родэн**
**штат Арызона ЗША**

Здзіўляе разнастайнасць рэсурсаў, якія выкарыстоўваюць мастакі. Што агульнага, напрыклад, паміж Джэймсам Турэлам, амерыканскім мастаком, які стварыў кавалачак казкі ў кратэры вулькана ў штаце Арызона, з якога можна назіраць за зоркамі, і Германам дэ Врайсам, які проста перанёс у горад некалькі квадратных метраў некранутай чалавекам прыроды.

Мастакі лэнд-арта выкарыстоўваюць прыроду не для таго, каб выклікаць у людзей якія-небудзь эмоцыі наконт яе прыгажосці, а хутчэй наадварот, пераўтвараюць яе, вылепліваюць з яе нешта незвычайнае. Калі можна так сказаць, яны ўпарадкоўваюць прыроду – ствараюць правільныя формы там, дзе іх першапачаткова не магло быць.



**Роберт Смітсан, Спіральны мол**
**Вялікае Саленае возера, штат Юта, ЗША**

Асноўны матэрыял – зямля,

мастакі выкарыстоўваюць яе і ўсё, што яна дае. У сімвалічнай форме гэта азначае, што мастакі спрабуюць падабрацца да самай сутнасці мастацкага твора. Выкарыстоўваючы архітэктурны падыход, альбо праз эфемернае пераўтварэнне адносінаў з прыродай, яны сцвярджаюць, што іх праекты адлюстроўваюць некаторую зайздрасць да навакольнага асяроддзя: людзі паміраюць, а прырода жыве вечна. Мастакі лэнд-арта, якія не жадаюць спыняць ход часу, паказваюць нам, наколькі далёка мы адышлі ад прыроды.



## Выкарыстаныя крыніцы:


1. http://kombat.com.ua/stat17.html
2. http://en.wikipedia.org/wiki/Outdoor_education
3. http://de.wikipedia.org/wiki/Erlebnisp%C3%A4dagogik
4. http://wilderdom.com/definitions/definitions.html
5. http://wilderdom.com/theory/Overview.html
6. http://www.bookap.by.ru/genpsy/bigdic/gl29.shtm
7. http://selard.com/
8. http://www.overgrass.ru/pages/project.htm
9. http://de.wikipedia.org/wiki/Land_Art
10. http://xz.gif.ru/numbers/60/smitson/
11. Cook L. (1999). The 1944 Education Act and outdoor education: from policy to practice. *History of Education*, *28*(2), 157-172
12. Knapp, C. E. (1994). Progressivism never died, it just moved outside: What can experiential educators learn from the past? *Journal of Experiential Education*, *17*(2), 8-12.
13. Hattie, J. A., Marsh, H. W., Neill, J. T. & Richards, G. E. (1997). Adventure Education and Outward Bound: Out-of-class experiences that have a lasting effect. *Review of Educational Research*, *67*, 43-87
14. Kurt Hahn: *Reform mit Augenmaß. Ausgewählte Schriften eines Politikers und Pädagogen*. Hrsg. von Michael Knoll. Klett-Cotta, Stuttgart 1998.
15. Michael Rehm. Was ist „Erlebnispädagogik“?, „e&l – Zeitschrift für Handlungsorientierte Pädagogik“. GBI Berlin, 5/96, 4Jg.
16. Детское общественное объединение «Ассоциация белорусских гайдов», Музыченко Л., Подзорова Н. Книга для лидера. – Гомель: Республиканское унитарное предприятие «Центр научно-технической и деловой информации», 2002. – 212с.